# ВЫЖЫЎ У КОЎНЕ, КАБ ЗАГІНУЦЬ У БЕЛАРУСІ: ТРАГІЧНЫ ЛЁС ВЯЗНЯ КАЎНАСКАГА 9-га ФОРТА ГАРНІКА АНАТОЛЯ ЯФІМАВІЧА

СЯРГЕЙ НОВІКАЎ

***Анатацыя:*** Упершыню па дакументальных крыніцах праведзена даследаванне рэальных прычын расстрэлу вязня каўнаскага 9-га форта – Анатолія Яфімавіча Гарніка. Аўтар спрабуе абвергнуць тэзіс аб тым, што баец партызанскага атрада імя Чкалава партызанскай брыгады "Наперад" Гарнік з'яўляўся "здраднікам радзімы". На аснове аналізу дакументальных крыніц паказана, што А.Я. Гарнік з'яўляўся жывым сведкам нацысцкіх злачынстваў у дачыненні да яўрэяў на тэрыторыі каўнаскага 9-га форта ў гады германскай акупацыі.

***Ключавыя словы:*** германская акупацыя, нацысцкая палітыка генацыду, Халакост, 9-ы форт Каўнаса, культура памяці.

# SURVIVED IN KAUNAS TO DIE IN BELARUS. A TRAGIC FATE OF A. GARNIK, A PRISONER OF THE NINTH FORT IN KAUNAS

***Abstract:*** The real reasons for the shooting of a prisoner of the Ninth Fort in Kaunas – Anatoly Garnik – are investigated on the basis of documentary sources for the first time. The author tries to refute the thesis that Garnik, being a member of the Chkalov "Forward" Partisan Brigade, was a "traitor." Based on the analysis of documentary sources the author shows that A. Garnik was a living witness of Nazi crimes against Jews in the Ninth Fort of Kaunas during the German occupation.

***Keywords:*** German Occupation, Nazi Policy of Genocide, Holocaust, Kaunas Ninth Fort, Remembrance Culture.

Прадметам нашага даследавання з'яўляецца трагічны лёс пакуль малавядомай асобы, якая выжыла ва ўмовах нямецкага палону і смяротных выпрабаванняў у каўнаскім 9-м форце, аднак пасля паспяховых уцёкаў адтуль загінула на беларускай зямлі. Аўтар спрабуе праясніць асобныя старонкі яе біяграфіі на падставе дакументаў, выяўленых у фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Украіна (Адэса, Чарнігаў, Кіеў), Беларусь (Гомель, Мінск, Баранавічы, Беласток, Гродна), Літва (Вільнюс, Каўнас), Беларусь (Налібоцкая пушча, Івянец) – менавіта гэтыя геаграфічныя пункты, згаданыя ў асабовай справе, вызначаюць адметныя старонкі жыццёвай біяграфіі народжанага ў Адэсе старшага тэхніка па прыборах 54-га авіяпалка, памочніка начальніка штаба ваенна-паветраных сіл Паўднёва-Заходняга фронту, члена УКП (б), капітана Чырвонай Арміі Анатоля Яфімавіча Гарніка.

Увосень 1941 г. ён трапляе ў Каўнас спачатку як савецкі ваеннапалонны, а пасля выкрыцця летам наступнага года яго яўрэйскага паходжання адпраўлены ў 9-ы форт, дзе з 10 лістапада 1943 г. знаходзіўся у складзе спецыяльнай рабочай каманды па эксгумацыі і спальванні целаў раней забітых яўрэяў. Адтуль яму разам з 63 іншымі вязнямі ўдалося ажыццявіць спачатку дзёрзкія ўцёкі ў ноч з 25 на 26 снежня 1943 г. [1], потым вытрымаць шматкіламетровы пераход у раён Налібоцкай пушчы, дзе ў рэшце рэшт на Мішучанскіх хутарах каля Іўя напаткаць беларускіх партызан з атрада імя Чкалава партызанскай брыгады "Наперад". Па стане на 1.02.1944 г. у склад брыгады ўваходзіла 647 чалавек, у тым ліку ў склад партызанскага атрада імя Чкалава, куды патрапіў былы вязень 9-га форта Каўнаса, – 188: з іх 97 – беларусаў, 45 – яўрэяў, 33 – рускія, 10 – украінцаў, 2 палякі і 1 прадстаўнік іншай нацыянальнасці [2]. Паводле запісу ўліку за №280 у "Імянным спісе асабовага складу партызанскай брыгады "Наперад" Баранавіцкай вобласці" Гарнік А.Я. значыцца ў якасці байца з 27 студзеня 1944 г. [3]. З 31 студзеня да 9 лютага знаходзіўся пад арыштам, быў неаднаразова дапытаны, "падвяргаўся агентурнай апрацоўцы", у выніку чаго даў шэраг каштоўных звестак "дзяржаўнага значэння" [4].

Апошні ўласнаручны запіс баец партызанскага атрада імя Чкалава Гарнік А.Я. пакінуў пад пратаколам допыту 8 лютага 1944 г. На тытульным аркушы асабовай справы Анатоля Яфімавіча Гарніка, якую ўдалося выявіць аўтару гэтых радкоў у фондах НАРБ,[1] значыцца наступная рэзалюцыя: баец атрада «растрелян [так у тэксце. – С.Н.] как изменник родины при попытке к бегству» [5]. Нагадаем чытачу, што паводле "Імяннога спісу" насамрэч баец атрада імя Чкалава "выбыў па распараджэнні штаба партызанкай брыгады "Наперад" [2]

---

[1] Аўтар выказвае падзяку вядучаму архівісту Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдату гістарычных навук, дацэнту В.Д. Селяменеву за інфармацыйную падтрымку.

у распараджэнне начальніка Беларускага штаба партызанскага руху [4]. Але на месца прызначэння не патрапіў па прычынах, якія можна высветліць толькі цяпер дзякуючы ўвядзенню новых дакументальных крыніц.

Звернемся да іх. Але спачатку пазнаёмім чытача з яшчэ адным важным дакументам – афіцыйным адказам Інстытута гісторыі партыі ЦК КП Беларусі 31 снежня 1964 г. на запыт грамадзянкі Гарнік С.Р. [жонкі А.Я. Гарніка. – С.Н.] у партархіў гэтай установы, у якой на той час захоўваўся значны корпус дакументаў Беларускага штаба партызанскага руху (фонд 3500). Архіўная даведка ўтрымлівае наступны тэкст: «ГАРНИК Анатолий Ефимович 1915 года рождения значится рядовым партизаном в списке партизанского отряда по состоянию на январь 1944 г. Даты прибытия в отряд и данных гибели его в партизанах не имеется. Архивная справка составлена по материалам партархива» [6].

Як вынікае з праведзенага аўтарам гэтых радкоў даследавання, і ў першым, і ў другім, і ў трэцім выпадках, датычных Гарніка А.Я., у даведцы і рэзалюцыі на справе ўтрымліваюцца лжывыя сцверджанні, абвергнуць якія неабходна па прычыне таго, што яны не адпавядаюць гістарычным фактам, замацаваным у вядомых на цяперашні час дакументальных крыніцах. Па-першае, як згадвалася вышэй, паводле запісу ўліку за №280 у "Імянным спісе асабовага складу партызанскай брыгады "Наперад" Баранавіцкай вобласці", Гарнік А.Я. значыўся ў якасці байца з 27 студзеня 1944 г. [3]. Па-другое, з рэзалюцыі на асабовай справе Анатоля Яфімавіча Гарніка вынікае канкрэтны факт таго, што на адрэзку часу, калі баец атрада "выбыў па распараджэнні штаба партызанскай брыгады "Наперад" [2] у распараджэнне начальніка Беларускага штаба партызанскага руху [4], ён быў расстраляны. І па-трэцяе, спроба як быццам бы "яго ўцёкаў", як пра тое сведчыць рэзалюцыя на тытульным аркушы, не магла з'яўляцца доказам самой здрады, пра што сцвярджаецца ў рэзалюцыі. Праліць святло на абставіны расстрэлу Гарніка А.Я. даюць магчымасць звесткі не "Гісторыі ўзнікнення і арганізацыі партызанскай брыгады "Наперад" Баранавіцкай вобласці БССР, 1942–1944 гг." [7], а ўспаміны аднаго з паплечнікаў уцекача – Алекса Файцельсона, які быў арганізатарам і кіраўніком паспяховых уцёкаў з 9-га форта, таксама патрапіў на беларускую тэрыторыю, але апынуўся ў іншым партызанскім атрадзе. Больш за тое, пасля вызвалення Беларусі і далучэння да Чырвонай Арміі ён удзельнічаў у баях за вызваленне Мінска, а сваю баявую біяграфію завяршыў пад Кёнігсбергам [8].

Паводле яго звестак, згаданых у кнізе пра ўнікальныя ўцёкі ў ноч з 25 на 26 снежня 1943 г. з 9-га форта ў Коўне, Гарнік быў забіты "па

непаразуменні" падчас яго адпраўкі з партызанскага аэрадрома блізу Івянца разам з раненымі партызанамі і з групай тых, хто супрацоўнічаў з немцамі за часам акупацыі, служыў у мясцовай паліцыі. У той момант, калі немцы пачалі абстрэл аэрадрома, адбыўся расстрэл гэтай групы падазраваных, да ліку якіх па непаразуменні быў аднесены і А.Я. Гарнік. Як сцвярджае кіраўнік арганізаваных уцёкаў з каўнаскага 9-га форта А. Файцельсон, Гарнік не з'яўляўся здраднікам і яго адпраўлялі ў Маскву як важнага відавочцу, як сведку для дачы паказанняў [8].

Такім чынам, справу навуковага пошуку неабходна весці, пакуль не будуць вернуты імёны. Апроч вырашэння навуковых задач, гэтага вымагае сучасная культура памяці.

***Бібліяграфія***


1. *Дело Анатолия Ефимовича Гарника.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НА РБ), Ф. 3500, воп. 2, спр. 8.

2. *Именной список № 209 личного состава партизанской бригады «Вперед» Барановичской области (начало 03.1942 г. – окончание 1944 г.).* НА РБ, Ф. 1450, воп. 1, спр. 431, арк. 11 адв.–12.

3. *История возникновения и организации партизанской бригады «Вперед» Барановичской области БССР, 1942–1944 гг.* НА РБ, Ф. 1450, воп. 4, спр. 316.

4. Любарский, Леонид (2014). "Дерзкий побег 64 заключенных из девятого форта Каунаса", *Заметки по еврейской истории,* 4, URL (доступ 09.09.2016): http://izrus.co.il/history/article/2014-09-05/23126/html.

5. *Сведения о составе партизанской бригады «Вперед» по состоянию на 1.02.1944 г.* НА РБ, Ф. 1399, воп. 1, спр. 243, арк. 77.

6. *Спецсообщение № 0011 от 14 февраля 1944 г. помощника уполномоченного ЦШПД при Ставке Верховного Главнокомандующего и ЦК КП (б) Беларуси по Барановичской области Гапеева и начальника оперативно-чекистской группы Лидской зоны майора госбезопасности Лыскова.* НА РБ, Ф. 1450, воп. 2, спр. 8, арк. 225..

7. Файтельсон, Алекс (2000). "Налибокская пуща", *Мишпоха,* 7, URL (доступ 10.11.2016): http://webcache.googleusercontent.com/search?q=cache: is7oLlFxUAcJ:mishpoha. org/7/ puss.html&num=1&hl=ru &gl=by&strip=0&vwsrc=0

8. Экспанат фонда каўнаскага музея IX форта, Архивная справка партархива Института истории партии ЦК КП Беларуси от 31 декабря 1964 г.